36,6°

Ад маленькага крывасмока — вялікія непрыемнасці

Сярод зялёнага лісця, пышнага кустоўя, густой травы нас можа падпільноўваць нябачная небяспека — кляшчы, якія ўжо адкрылі свой «паляўнічы» сезон.

— На сярэдзіну мая, — распавядае этымолаг эпідаддзела Рэспубліканскага цэнтра гігіены і грамадскага здароўя Святлана Яшкова, — было зарэгістравана больш за 960 выпадкаў пакусаў кляшчамі людзей, з іх больш за 300 — дзяцей. І хоць у параўнанні з мінулым годам гэтая колькасць меншая прыкладна на 16 %, аднак сітуацыя трывожная, і звязана яна з павелічэннем колькасці саміх кляшчоў, асабліва ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях. Таму насцярожанасць у людзей павінна быць.

Маленькі клешч можа прынесці вялікія непрыемнасці, у прыватнасці, стаць прычынай заражэння хваробай Лайма, пра якую мы сёння пагаворым. Да заражэння ёй успрымальныя ўсе людзі, незалежна ад узросту і полу. Асабліва рызыкуюць тыя, хто знаходзіцца ў лясной мясцовасці, а таксама ў лесапарках і на агародных участках.

Праявы хваробы

Інкубацыйны перыяд хваробы Лайма можа доўжыцца ад 1 да 50 дзён і ўключае ў сябе некалькі стадый. Пры першай стадыі для 40—50 працэнтаў інфіцыраваных на працягу першага месяца пасля ўкусу характэрныя ліхаманка, галаўныя болі, слабасць, болі ў мышцах і суставах. Тэмпература цела можа быць высокай — да 39—40 °С. Ліхаманка можа цягнуцца да 10—12 сутак. Асноўная прыкмета, спецыфічная для хваробы Лайма, — эрытэма (мігрыруючае кольцападобнае пачырваненне).

Прыкладна ў 20 працэнтаў хворых гэта можа быць адзінай праявай першай стадыі хваробы. Спачатку на месцы ўкусу кляшча ўзнікае чырвоная пляма, якая паступова пашыраецца ва ўсе бакі.

Другая стадыя развіваецца ў 10—15 % інфіцыраваных праз некалькі тыдняў ці месяцаў (звычайна пры адсутнасці адэкватнага лячэння). На гэтай стадыі паражаюцца сардэчна-сасудзістая сістэма, скура, печань, вочы, ныркі. З'яўляецца запаленне суставаў, якое нагадвае рэактыўны артрыт. Церпяць пераважна буйныя суставы (каленныя, плечавыя, локцевыя). Першыя прыкметы артрыту праяўляюцца болем у вобласці сустава і абмежаваннем рухомасці. Працягласць артрыту ад 8 дзён да 3 месяцаў. Без лячэння хвароба Лайма можа набыць хранічнае цячэнне. А гэта ўжо трэцяя стадыя захворвання. Яна характарызуецца працягласцю, рэцыдывамі, павышанай слабасцю, галаўным болем, парушэннямі сну, паражэннем розных органаў і сістэм.

Ці можна пазбегнуць хваробы Лайма?

Найбольш дзейсны сродак прафілактыкі хваробы Лайма — захаванне мераў перасцярогі на тэрыторыях, дзе распаўсюджаны кляшчы-пераносчыкі: прымяненне спецыяльных засцерагальных касцюмаў ці прыстасаванага адзення, якое не дасць кляшчам магчымасці запаўзці за каўнер. Кашуля павінна мець доўгія рукавы, замацаваныя ў запясці гумкай. Кашулю запраўляюць у штаны, канцы апошніх — у шкарпэткі і боты. Галаву і шыю закрываюць хусткай.

Яшчэ адной мерай прафілактыкі можа быць вакцынацыя. Праводзіцца яна ў тры этапы: першы — восенню (у кастрычніку—пачатку лістапада), другі — вясной (у сакавіку—пачатку красавіка). Пасля гэтага ўжо можна смела хадзіць у лес. Праз 12 месяцаў неабходна зрабіць трэцюю прышчэпку, а далей паўтараць вакцынацыю з перапынкам у тры гады. Калі хочаце правесці вакцынацыю сваім дзецям, то абавязкова парайцеся з урачом, бо не ўсе прэпараты аднолькавыя па сваіх уласцівасцях і маюць розныя абмежаванні па ўзросце дзіцяці.

Як правільна выдаліць кляшча?

Калі клешч усё ж укусіў, яго неабходна выцягнуць са скуры. Рабіць гэта трэба максімальна асцярожна. Ні ў якім выпадку яго нельга давіць пазногцямі ці пінцэтам, расчэсваць і спрабаваць вырваць сілай. У такіх выпадках узнікае вялікая небяспека таго, што клешч упырсне ў арганізм вялікую порцыю сваёй сліны, а разам з ёй і інфекцыю.

Выдаліць кляшча з цела можна, калі капнуць на яго нешта тлустае, напрыклад, алей або любы спіртавы раствор. Затым узяцца за яго ватай і, не спяшаючыся, паспрабаваць выцягнуць яго са скуранога покрыва. Калі не ўпэўненыя ў тым, што зможаце выдаліць кляшча самастойна, трэба звярнуцца ў бліжэйшы траўмапункт, дзе кляшча выдаляць, а вам зробяць ін'екцыю імунаглабуліну.

Хто лечыць хваробу Лайма?

Пры падазрэнні на хваробу Лайма неабходна звярнуцца да ўрача-інфекцыяніста, каб удакладніць дыягназ і прызначыць спецыфічную тэрапію. Памятайце, запозненае лячэнне можа быць прычынай вялікіх ускладненняў. Калі ўскладненні развіліся, спатрэбіцца кансультацыя некалькіх профільных спецыялістаў: рэўматолага, кардыёлага і інш.

Вольга ШАЎКО.

Таксіны і шлакі — на выхад!

Здароўе на талерцы

Штодзень мы ўдыхаем шкодныя рэчывы ад выхлапных газаў, прамысловых выкідаў, якія асядаюць у тканках арганізма. Высокакаларыйная ежа на скорую руку з фаст-фудаў, якой мы так любім сябе пачаставаць, таксама нашпігавана таксінамі і мала адпавядае фізіялагічным патрэбам чалавека. Ад таго, што мы лянуемся займацца спортам і больш рухацца, пагаршаецца маторыка кішэчніка. Лекі, якія мы спяшаемся прыняць па прычыне і без яе, з'яўляючыся хімічна сінтэзаванымі, з часам назапашваюцца ў арганізме. Усё гэта вядзе да дысбалансу фізіялагічных функцый, парушэння работы лёгкіх, нырак, печані, кішэчніка, скуры, а нярэдка і да з'яўлення розных паталогій. Галаўны боль, дрэнны апетыт, хуткая стамляльнасць, раздражняльнасць, алергічныя рэакцыі — гэта яшчэ не поўны «букет» праяў зашлакаванасці арганізма.

Калі органы выдзялення перастаюць спраўляцца і затрымка шкодных рэчываў адбываецца — неабходна дапамагчы арганізму выгнаць яды, але рабіць гэта трэба правільна і з розумам. Дарэчы, клізмы, якія сталі апошнім часам такімі папулярнымі пры ачышчэнні арганізма, не дапамагаюць, а наадварот, разбураюць адладжаную сістэму, вымываюць карысную мікрафлору, парушаючы ахоўныя функцыі імунітэту, прыводзяць да ўзнікнення праблем са стулам. Таму прызначаць такія працэдуры — кампетэнцыя доктара.

Як жа дапамагчы арганізму выгнаць яды? Першнаперш варта змяніць звычкі і перавагі ў харчаванні. Пастарацца збалансаваць, зрабіць больш разнастайным свой рацыён. Для гэтага пачніце ўжываць пабольш расліннай клятчаткі, прасцей кажучы — агародніны і садавіны. Яны багатыя на пекціны, харчовыя валокны і вітаміны. Гэта тры катэгорыі рэчываў, якія дапамагаюць «звязваць» і выводзіць усё непатрэбнае з арганізма: адсарбаваць таксіны, лішнія тлушчы і нават цяжкія металы, паскараючы іх праходжанне праз органы выдзялення. Акрамя таго, яны пасадзейнічаюць паслабленню стулу, а вітаміны як унікальныя элементы яшчэ і дапамогуць правільна перапрацаваць усё тое, што трапляе да нас унутр праз паветра і ежу, засвоіць карыснае і выгнаць шкоднае. У дзень трэба з'ядаць не менш як 300—500 грамаў такой прыроднай «хуткай дапамогі», каб забяспечыць вышэйзгаданы вынік. Прычым агародніну (буракі, капусту, радыску, рэпу, гарбузы, кабачкі) можна ўжываць як у свежым, так і ў апрацаваным выглядзе. Пры гэтым валокны не падвяргаюцца расшчапленню, а вось вітаміны могуць страціць свае карысныя ўласцівасці. Але іх недахоп можна смела кампенсаваць свежай садавіной. Асабліва рэкамендуюцца ў гэтым выпадку агрэст, дыня, абрыкосы, яблыкі, інжыр, слівы, чорныя парэчкі, чарнасліў. А гароднінная зяленіва, акрамя вітамінаў і валокнаў, багатае яшчэ і на неабходныя арганізму мікраэлементы, напрыклад, такія, як хром, медзь, марганец, жалеза. У адрозненне ад аптэчных вітамінна-мінеральных комплексаў, карысныя рэчывы ў зяленіве, агародніне і садавіне знаходзяцца ў выглядзе арганічных соляў, таму і засвойваюцца чалавекам лепш і хутчэй.

Таксама звярніце ўвагу на прадукты, абагачаныя валокнамі. Такімі, напрыклад, з'яўляюцца крупы з вотруб'ем. Яны дзейнічаюць як мяцёлка для кішэчніка, выправаджваючы тое, што затрымалася. Але памятайце: вотруб'е лічыцца грубымі валокнамі, таму з іх ужываннем нельга перабіраць — 50 грамаў у суткі будзе дастаткова. (Вотруб'е не рэкамендуецца прымяняць у востры перыяд пры гастрыце, язвавай хваробе, каліце і энтэрыце.)

Натуральна, харчавацца выключна прадуктамі, якія дапамагаюць праходжанню і вывядзенню шлакаў, нельга. Акрамя іх, у рацыёне абавязкова павінны быць мяса, рыба, малочныя прадукты. Інакш існуе рызыка давесці арганізм да фізічнага і нервовага знясілення. Як зазначаюць медыкі, каб не захварэць і адчуваць сябе на «выдатна», харчавацца трэба па прынцыпе «ўсё ўключана».

Другі немалаважны фактар — ужыванне вады. Для паўнацэннай работы органаў выдзялення дастатковая колькасць «вільгаці» — неабходная ўмова. Чалавеку трэба выпіваць як мінімум два літры вадкасці ў суткі, бо чым больш вады паступіць у арганізм, тым больш выйдзе з яго розных ядаў. Калі ж вадкасці ўжываць менш за норму, гэта прывядзе да частых запораў і застояў шлакаў. У чыстым выглядзе, зразумела, цяжка выпіць такую колькасць вады, таму яе недахоп варта запаўняць усялякімі супамі, мінеральнай вадой, травяной гарбатай. Вельмі добра піць свежыя сокі і сокавыя сумесі: маркоўны, бурачковы, маркоўна-яблычны і г.д. Яны аднаўляюць мікрафлору кішэчніка, насычаюць арганізм пажыўнымі рэчывамі.

І яшчэ. Спецыялісты рэкамендуюць пачынаць кожны дзень са шклянкі вады, а заканчваць — шклянкай кефіру. Гэта запускае работу кішэчніка, забяспечвае яго бесперабойную дзейнасць, потым заспакойвае, садзейнічае добраму начному страваванню і нармальнаму аднаўленню сілаў.

Дапамагаюць у вывядзенні шлакаў і эфектыўныя пры дрэннай маторыцы кішэчніка алеі — аліўкавы і сланечнікавы. А вось жывёльныя і кулінарныя тлушчы, наадварот, садзейнічаюць накапленню таксінаў, таму іх ужыванне трэба звесці да мінімуму. Дарэчы, актывізаваць работу выдзяляльнай сістэмы можна з дапамогай лекавых раслін, якія стабілізуюць сакраторныя функцыі, дзейнічаюць паслабляльна. Гэта могуць быць аніс, мацярдушка, рамонак, кара крушыны, лакрычны корань, кроп, кмен.

САЛАТА-МЯЦЁЛКА

Гатуецца са свежай капусты, морквы і буракоў у суадносінах 3:1:1. Капусту нашаткаваць, моркву і буракі надзерці на буйной тарцы. Усё перамяшаць і размяць да выдзялення соку. Салату не саліць, заправіць алеем, есці раніцай нашча і на ноч за 2—3 гадзіны да сну.

ЦУДАДЗЕЙНЫ ДЭСЕРТ

250 г курагі змяшаць з такой жа колькасцю чарнасліву, дадаць 1 ст. лыжку александрыйскага ліста (касіі), 1 ст. лыжку аліўкавага або льнянога алею і 1 ч. лыжку мёду. Усё гэта размяшаць, захоўваць сумесь у халадзільніку, з'ядаць на ноч 2—3 ст. лыжкі.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

РУП «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ» ИЗВЕЩАЕТ

16 июня 2009 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4, состоится АУКЦИОН по продаже объектов недвижимого имущества, принадлежащих ликвидируемому предприятию ОАО «Белаттракцион», в составе следующих лотов:

Лот № 1	Комплекс зданий и сооружений, расположенный по адресу: г. Минск, ул. Ташкентская, 25, в составе: - капитальное строение с инвентарным номером 500/С-48231 (здание административно-хозяйственное) общ. пл. 69,6 кв.м; - капитальное строение с инвентарным номером 500/С-48232 (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) общ. пл. 67 кв.м; - ограждение металлическое (забор), асфальтобетонное покрытие.
Лот № 2	Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-48537 (здание специализированное иного назначения (павильон)) общ. пл. 59,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Фрунзе, 2.
Лот № 3	Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-48263 (здание специализированное энергетики) общ. пл. 8,9 кв.м, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 84.

Общие сведения	Лот № 1	Лот № 2	Лот № 3
Собственник имущества	Открытое акционерное общество «Белаттракцион», УНП 100061627		
Организатор торгов	РУП «Белтехинвентаризация», г. Минск, ул. Чапаева, 4, УНП 190305149		
Начальная цена продажи, рублей без НДС	141 953 282	136 019 160	14 845 073
Размер задатка, рублей	14 195 328	13 601 916	1 484 507
Площадь земельного участка	0,0164 га, в т.ч.: 0,0074 га – кадастровый № 500000000002006759, правовой режим – право временного пользования; 0,0090 га – кадастровый № 500000000002006760, правовой режим – право временного пользования.	0,0106 га – кадастровый № 500000000001004775, правовой режим – право постоянного пользования.	0,0021 га – кадастровый № 500000000009004063, правовой режим – право постоянного пользования.
	Земельные участки имеют ограничения (обременения) прав в использовании земель. Вид ограничений (обременений) прав:		
	земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код-2.	земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код-1.	
Условия продажи	аукцион без условий		
Срок заключения договора купли-продажи	в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона		
Условия оплаты	определяются по согласованию Победителя торгов с Собственником имущества при заключении договора купли-продажи		
Номер р/с Организатора торгов для перечисления задатка	р/с 3012221130016 в Московском отд. ОАО «Белинвестбанк» в г. Минске, код 741, УНП 190305149 (р/с 3012221138047 в рос. рублях, р/с 3012221135024 в долларах США)		
Срок подачи документов	до 15 июня 2009 г. с 8.30 до 17.30		

*Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней с даты проведения аукциона оплатить Организатору торгов вознаграждение в размере 5 % от продажной цены лота.

**Более подробная информация об условиях участия в аукционе, характеристиках продаваемого имущества опубликована в газете «Недвижимость Белоруссии» № 22 от 30 марта 2009 г.

Получить дополнительную информацию о продаже имущества можно по адресу: г. Минск, ул. Чапаева, 4 или связавшись с нами по телефонам: 8 (017) 285 33 28, 222 73 14, 8 (029) 68 77 44 1 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Наш сайт в интернете: www.bti.by

ХОЧАШ РАССМЯШЫЦЬ БОГА?

УПАСЦІ — І НЕ РАЗБІЦЦА

Інэса* — асоба моцная, валявая, харызматычная. Нездарма яе любімай кнігай з'яўляюцца «Знесеныя ветрам» Маргарэт Мітчэл, а жаночым ідэалам — яе гераіня Скарлет О'Хара.

Яшчэ на парозе самастойнага жыцця яна вырашыла: у яе будзе адно дзіця, дачка. Але яна будзе мець усё! Яна будзе самая разумная, паспяховая, багатая. Маці дасць ёй цудоўную адукацыю і пабудуе кватэру ў Мінску.

Кажуць: хочаш рассмяшыць Бога — раскажы яму пра свае планы.

Не, спачатку ўсё ішло, як было запланавана. Інэса, прыгожая маладая дзяўчына, пасля каледжа стала працаваць, неўзабаве закахалася ў «першага хлопца» і выйшла замуж. Муж быў пры грашах і пры пасадзе. Маладая сям'я — у іх неўзабаве нарадзілася дачка Даніэла — жыла ў дастатку, ні ў чым сабе не адмаўляючы.

— Калі я азіраюся на сябе ранейшую, мне становіцца страшна. Я, шчырая каталічка, якая вырасла ў глыбока рэлігійнай сям'і, перастала хадзіць у касцёл — муж лічыў, што гэта зборышча для няўдачнікаў. Маючы ўсё, не разумела, што нехта можа адмаўляць сабе ў самым неабходным, недаядаць, не мець чаго апрануць. Напэўна, трэба было ўсё страціць, каб зразумець сутнасць жыцця. І каб я не атрымала гэты ўрок, нічога б з мяне не атрымалася.

Усё знікла ў імгненне вока: сям'я, грошы, вольнае жыццё. Муж пакінуў іх і пайшоў жыць да іншай жанчыны. Яна засталася з дачкой практычна без сродкаў для існавання — яе зарплаты не хапала нават на самае неабходнае. Знаёмыя, якія раней міла ўсміхаліся і раскланьваліся пры сустрэчы, на рынку, улічваючы месца працы яе мужа, аддавалі ўпадабаную ёй рэч за паўцаны ці ўвогуле дарылі, перасталі вітацца. Крызіс быў і матэрыяльны, і душэўны, яшчэ больш цяжкі ад таго, што падаць давялося з неймавернай вышыні. Некалькі гадоў запар яна брала ўвосень адпачынак і ехала ў калгас, каб падзарабіць якую капейчыну на бульбе. Часам вечарамі проста чакала, калі разыдуцца выпівохі ў калідоры іх інтэрната, каб сабраць пасля іх і здаць бутэлькі.

— Аднойчы я зразумела, што ў мяне два шляхі. Адзін — лёгкі, зручны — уніз: сяброўкі, бутэлька, пашкадуйце мяне, няшчасную. Другі — наверх, цяжкі, пад зайздроснымі позіркамі — у нас жа заўсёды больш любяць убогіх і абяздоленых, якім так прыемна паспачуваць, чым паспяховых і незалежных — такія выклікаюць зайздрасць і раздражненне. І вось тады я вырашыла: я не дастаўлю радасці спачуваць мне. Я ўсяго дасягну. Атрымаю вышэйшую адукацыю. У мяне будзе вялікі прыгожы дом. Мая дачка будзе жыць у дастатку, у яе будуць самыя прыгожыя рэчы і бліскучая будучыня. У мяне будзе ўсё! У той час мне вельмі дапамог ксёндз Мікалай, які працаваў тады ў нашым касцёле. Ну і, вядома, мае бацькі. І бабуля, Ірына Іванаўна, якая для мяне — найпершая сяброўка.

Першым крокам па выцягванні сябе з дэпрэсіі сталі вадзіцельскія курсы. Затым Інэса паступіла ў Інстытут кіравання і прадпрымальніцтва. Плаціла за вучобу і ўмудралася адкладваць са сваёй невялікай зарплаты хоць па некалькі долараў на блакітную мару пра будучы дом. Расціла дачку. Яна кінулася ў жыццё, як у вір, галавой — каб не засмактала балота...

І ТАДЫ НАРАДЗІЎСЯ УЛАД...

А потым у яе жыцці з'явіўся Ваня...

— Мне заўсёды падабаліся хлопцы, намнога старэйшыя за мяне. З аднагодкамі мне было нецікава, я не ведала, пра што з імі гаварыць. Калі б мне хто сказаў, што ў мяне будзе муж на тры гады маладзейшы — нізавошта не паверыла б...

...Хочаш рассмяшыць Бога...

Маладога хлопца не спыніла ні тое, што ў яе пашпарце ўжо два штампы — аб шлюбе і разводзе, ні што Інэса старэйшая за яго, ні што ў яе падрастае дачка. А яе падкупіла тое, як ён ставіцца да яе. І найперш — да Даны. Дзяўчынцы было лёгка, камфортна, радасна побач з ім. І гэта вырашыла ўсё.

Яны пажаніліся. І Івана, які толькі закончыў універсітэт, забралі ў армію. І зноў — адна, зноў — эканомія на ўсім, мара пра дом — цяпер ужо для іх сям'і, вучоба.

Бог умее не толькі смяяцца з нашых планаў. Ён яшчэ вядзе нас па жыцці — менавіта ў тым напрамку, які патрэбен, які сапраўдны, а не па той дарозе, якая можа падацца табе, аслепленаму ўяўнымі каштоўнасцямі, шляхам радасці і шчасця.

Здаецца, яны ўжо знайшлі прыдатны дом — ну хай сабе не зусім такі, пра які марылі, але зусім прыстойны, але ўсё нешта не складвалася... А потым гаспадыня і ўвогуле ім адмовіла... Здавалася, мара разбілася, як хрустальны келіх...

Але ў той самы момант яны даведаліся, што ў Астраўцы прадаецца двухпавярховы недабудаваны дом. Крэдыту, які дазваляла Інэсе ўзяць яе зарплата на новай, больш высокааплатнай працы, не хапала да яго цаны на 4 тысячы долараў. І роўна столькі, капейка ў капейку, яна паспела назбіраць за гэтыя гады змагання з лёсам. Дом яны купілі — і літаральна праз два месяцы цэны на нерухомасць рэзка падскочылі ўверх...

Іван вярнуўся з войска. Доўга не мог знайсці сабе нармальную работу, працаваў цяжка і за вельмі смешную зарплату. Яны дабудоўвалі дом — і зноў даводзілася эканоміць...

— Пра другое дзіця я нават не марыла. Але заўсёды лічыла: дзяцей павінна быць столькі, колькі дае Бог. І потым, я заўважыла, што Дана расце разумнай, самадастатковай, упэўненай у сабе дзяўчынкай — гэтыя якасці я выхоўвала ў ёй з маленства. Але ёй не хапае пачуццёвасці, суперажывання, спачування да тых, хто побач — бо побач няма таго, каго трэба любіць, аб кім клапаціцца. Што мы яе абдзяляем любоўю — не той, што даюць ёй, а той, што можа аддаць яна. І тады нарадзіўся Улад...

ДАМОЎ ВЯРНУЛІСЯ З УСІМІ ТРЫМА...

Калі Уладу споўніўся годзік, Інэса і Ваня вырашылі, што яму патрэбен брацік. Да таго часу дом яны дабудавалі, у Вані з'явілася нармальная праца, Інэса, як сама прызнаецца, дасягнула таго ўзроўню прафесіяналізму, калі можна выбіраць працу і зарплату, у сям'і быў дастатак.

Жаданне ўвогуле звычайнае. Але яны знайшлі для яго ажыццяўлення даволі арыгінальнае рашэнне: вырашылі, што трэба ўзяць у сям'ю некага з тых дзяцей, пра якіх гавораць: сіроты пры жывых бацьках.

— Нас часта пытаюць: навошта вам усё гэта? Хацелі дзяцей — нарадзілі б сваіх, маладыя ж яшчэ, здаровыя. Але нарадзіць — гэта не тое. Мы хацелі дапамагчы некаму з тых дзяцей, каго пакрыўдзіў лёс. Даць ім шанц, магчымасць выкараскацца, не прапасці ў гэтым свеце. Пра такіх дзяцей часта пішуць у газетах, паказваюць па тэлебачанні. Заўсёды пачытаеш, паўздыхаеш, паспачуваеш, паспадзяешся: можа, і знойдзецца добрае сэрца... І перагорнеш старонку... І аднойчы мяне ўзяла злосць на саму сябе: ах, якая ты добранькая — можа, хто і знойдзецца... А вось ты сама — ты змагла б? Дапамагчы хоць каму, хоць аднаму з іх?

Патрэбная кніга, артыкул, чалавек заўсёды прыходзяць у патрэбны момант. Якраз тады, як Інэса з Іванам «саспелі» для свайго неардынарнага рашэння, у раённай газеце «Астравецкая праўда» з'явіўся артыкул пра тры выхаванцаў мясцовага сацыяльнага прытулку пад традыцыйнай для гэтай газеты рубрыкай «Знайдзі мяне, мама» — дзвюх сястрычак і брацікa.

Пра тое, каб узяць у сям'ю ўсіх траіх, не магло быць і размовы. Яны хацелі толькі хлопчыка, брата для Улада...

...Хочаш рассмяшыць Бога...

Спачатку аднаго Ігара ім аддаваць адмовіліся — нельга разбіваць сям'ю, бярыце ўсіх траіх. «Нізавошта!» — сказала Інэса, і яны вярнуліся дамоў. Праз нейкі час ім зноў патэлефанавалі: забярыце хоць Ігарка. Для старэйшай, Эрыкі, таксама быццам бы знаходзіцца прыёмная сям'я, а сярэднюю, Карыну — што ж рабіць? — трэба афармляць у дзіцячы дом...

— Разумееце, я адчула перад гэтай незнаёмай мне дзяўчынкай, Карынай, незразумелае пачуццё віны. Што вось мы з-за нейкіх сваіх інтарэсаў не возьмем яе ў сям'ю, малую аддадуць у дзіцячы дом — і хто ведае, як складзецца яе лёс? А мы — мы маглі ёй дапамагчы — і не схацелі. Але ж на другой палове шаляў — двое чужых дзяцей... Гэта ж не кацяняты, гэта асобы — са сваім характарам, спадчыннасцю — не самай лепшай. Страшнавата... Паўночы мы прагаварылі з Ванем, узважвалі ўсе «за» і «супраць». І ўсё-такі рашыліся забраць і Карыну.

А калі яны прыехалі ў прытулак, аказалася, што людзі, якія хацелі ўзяць у сям'ю старэйшую, Эрыку, адмовіліся ад свайго першапачатковага рашэння...

Што было рабіць? Яна сказала мужу: «Ты мужчына — ты і вырашай». І ён вырашыў — дамоў вярнуліся з усімі трыма.

«ТОЛЬКІ НАЗАД НЕ АДДАВАЙ!»

— Калі мы прымалі гэтае рашэнне, мы, вядома, раіліся з Даніэлай. Дана доўга разважала, а потым спытала: «А ты не станеш мяне менш любіць, калі з'явяцца гэтыя дзеці?» Я адказала шчыра — я заўсёды стараюся быць шчырай з усімі, у тым ліку і з дзецьмі — што ніколі не змагу любіць іх так, як сваіх дзяцей. Я буду іх шкадаваць, клапаціцца, дбаць пра іх будучыню, але гэта — іншае. І гэта — праўда, я не хачу крывіць душой...

— Што было самым цяжкім? — перапытвае Інэса і на хвіліну змаўкае, вяртаючыся думкамі на год назад. — Прыняць іх такімі, якія яны ёсць. Бо, што граху таіць, напэўна, усе прыёмныя бацькі прыдумваюць сабе гэткіх херувімчыкаў з крылцамі, якія зараз з'явяцца ў сям'і... А яны — зусім не анёлы. Як, зрэшты, і ўсе дзеці. Але гэтыя — асабліва. Як успомню, як яны з'явіліся ў нас вясной мінулага года... У нейкіх дзікіх лахманах. Карына з невераятнай хлапчуковай стрыжкай. Ігар не разумеў, што такое хадзіць у прыбіральню — не таму, што быў хворы, а таму, што не лічыў патрэбным адрывацца ад гульні ці ежы для гэтага занятку. Яны ніяк не маглі наесціся, усё прасілі хлеба і супу. Што смачнейшае хавалі ў свае тумбачкі і шафы — і забываліся, я потым даставала ў час прыбірання сплеснявелы сыр ці згнілую каўбасу. Сёння яны зусім іншыя...

...Так, сёння яны зусім іншыя — я з цяжкасцю пазнавала сваіх колішніх знаёмцаў з прытулку. Ігар, які амаль не гаварыў, цяпер ходзіць на заняткі з лагапедам і бойка расказвае вершыкі. Тады ён пакідаў адчуванне разумова адсталага дзіцяці — цяпер мама Іна не нарадуецца яго поспехам у матэматыцы, таму, як хутка ён запамінае вершы і малітвы (усіх траіх пахрысцілі летась, і цяпер яны кожную нядзелю ўсёй сям'ёй ідуць у касцёл). Ігара, улічваючы яго поспехі, нават перавялі з сярэдняй групы ў старэйшую, а цяпер хлопчык марыць пра школу. А яшчэ ён прыгожа малюе, у доме цэлая папка з яго работамі — «Калі вырасцеш, будзеш паказваць сваім дзецям, каб яны маглі табой ганарыцца», — кажа мама. Ігар марыць перачытаць усе кнігі ў свеце, а яшчэ — працаваць на фуры, каб павезці на ёй маму Іну ў краму і купіць ёй там бліскучыя туфлі, бліскучую сукенку і бліскучы мабільнік. Праўда, мама бачыць яго ў будучым шыракаплечым, статным афіцэрам...

Карыне навука даецца цяжэй. Увогуле займацца ёй не вельмі хочацца. А вось спяваць пад караоке, танцаваць, прыбірацца — гэта яе стыхія. Яе аддалі ў музычную школу ў харэаграфічны клас — можа, там артыстычныя здольнасці ласкавай і пяшчотнай Карыны знойдуць сваё развіццё?

У музычную школу ходзіць і Эрыка, толькі ў клас фартэпіяна. Яна ўжо ўмее іграць «Калінку» і ахвотна дэманструе гэта гасцям. Вочы ў гэтай прыгожай светлавалосай дзяўчынкі па-ранейшаму вельмі разумныя і добрыя, вось толькі цяпер у іх замест колішняга жадання спадабацца кожнаму, хто з'яўляўся ў прытулку, пасялілася ўнутраная годнасць. Яна марыць стаць медыкам — «самым галоўным дзіцячым доктарам». Вучыцца добра. Праўда, год таму ў дзённіку былі ў асноўным «тройкі» і «чацвёркі», і аднакласнікі пасмейваліся над ёй і дражнілі закамплексаваную новенькую. Але летам мама спецыяльна наняла для Эрыкі і Карыны рэпетытара, каб падцягнуць іх. Цяпер у Эрыкі толькі дзве сямёркі, астатнія — «васьмёркі» і «дзявяткі», за гэты час у яе з'явілася ўпэўненасць у сабе, яна навучылася прыгожа і з густам апранацца — тут таксама даюць свой вынік маміны ўрокі, якія дзяўчынка з задавальненнем і паспяхова пераймае — і дражніць яе перасталі.

Эрыка вельмі хутка пасябравала з Даніэлай — Дана толькі на год старэйшая. Дзяўчынкі разам ходзяць у музычную школу. Праўда, Дана займаецца ўжо чацвёрты год у класе скрыпкі і — ах, як цудоўна іграе на гэтым каралеўскім інструменце! Хоць марыць яна не пра музычную кар'еру, а пра журналісцкую.

Ну а Улад — ён, як сам кажа, «самы маленькі», таму — усеагульны любімец.

Увогуле, усе яны розныя. І ў іх сям'і, як і ў любой іншай, здараецца рознае. Бываюць святы — як першыя ў жыцці прыёмнай тройкі сапраўдныя Каляды з вялікай сям'ёй за сталом, калі ўся іх сям'я збіраецца ў доме ў бабулі, з мноствам падарункаў, і менавіта такіх, пра якія марыў, з тваёй сямейнай, а не агульнай для ўсіх ёлкай. Ці дні нараджэння — іх Эрыка, Карына і Ігар таксама раней не ведалі, у іх нават дзіцячых фотаздымкаў няма. А цяпер да іх прыходзяць сябры, ім накрываюць святочны стол, віншуюць, дораць падарункі.

А бываюць, вядома, як і ва ўсіх, і канфлікты, і непаразуменні.

— Часам нашкодзіць каторы, раззлуюся, стану сварыцца: «Зараз адлупцую, — кажу. — Ці назад у прытулак адвязу». «Ты лепш набі мяне, мамачка, — просіць тады Ігар. — Моцна-моцна. Можаш нават крапівой. Ці палкай. Толькі назад не аддавай!» Я часам думаю: што ж ім давялося перажыць, вытрываць, калі для іх вяртанне ў прытулак — такое страшнае пакаранне?

А яшчэ большае — у былую сям'ю.

Аднойчы Эрыку сустрэла ля школы старэйшая сястра — яна, па сутнасці, была адзіным чалавекам у іх ранейшай сям'і, хто хоць неяк, як дазваляла ёй уласная дзіцячыя сілы і магчымасці, старалася накарміць і дагледзець шматлікую малечу. Толькі яе, а не «былую маму» — гэтыя словы Эрыка вымаўляе з некаторай запінкай — успамінаюць яны з цеплынёй. І тым не менш, калі дзяўчынка ўбачыла сястру, якая чакала малую ля школы, пачула яе голас, то расплакалася і бягом кінулася да мамы на работу. «Там Сандра!» — калоцячыся, выпаліла з парога. «Ну і што? — пастаралася супакоіць яе мама. — Не бойся, я нікому вас не аддам. А Сандра, ты ж расказвала, клапаціцася пра вас. Ці ты забыла?» «Я не хачу гэта помніць», — з дарослай сур'ёзнасцю адрэзала Эрыка.

СТАНЬЦЕ ЎПОРАВЕНЬ

...Іх не разумелі тады, як яны рашылі стварыць прыёмную сям'ю — ніхто, нават бацькі, нават лепшая сяброўка бабуля — «Ах, як бы добра ўсё было, каб у сям'і было толькі двое дзяцей, як ціха і спакойна» — уздыхае яна і цяпер час ад часу. На што Інэса нязменна адказвае:

— У мяне і цяпер усё добра, бабуля! Усё так, як павінна быць! У нас дагледжаныя дзеці, добрая сям'я, дастатак у доме.

— Але ж ты паглядзі на сябе: работа, гаспадарка, пяцёра дзяцей... Ты ж з сілаў хутка выб'ешся, — шкадуе бабуля ўнучку...

А ёсць тыя, хто не шкадуе — шукае ў іх учынку нейкія меркантыльныя інтарэсы. А калі парушынка ў чужым воку нават пры самым пільным разглядзе не знаходзіцца — значыць, «з галавой не сябруюць».

Каб стаць з некім упоравень, часам трэба да яго моцна падцягнуцца. Прасцей прынізіць да свайго ўзроўню...

— Я не ведаю, што стане з нашымі дзецьмі, кім яны вырастуць. Гэтага нельга спрагназаваць і з роднымі, а тым больш — з прыёмнымі. Але я даўно, яшчэ калі сядзела без кавалка хлеба, зразумела: усё, што ты аддаеш — і добрае, і дрэннае — вяртаецца да цябе ўтрая. Найчасцей — не ад таго, каму аддаеш, а зусім з нечаканага боку. І я вельмі спадзяюся, што нашы прыёмныя дзеці — Эрыка, Карына, Ігар — панясуць з сабой у дарослае жыццё нешта добрае з таго, што атрымаюць, убачаць, адчуюць у нашай сям'і. Хай тыя, хто шукае ў нашым учынку меркантыльнасць, лічаць, што яна заключаецца менавіта ў гэтым. А яшчэ яны могуць зрабіць так, як мы — абяздоленых дзяцей, на жаль, яшчэ вельмі многа.

Я ніколі не азіраюся назад, не дазваляю сабе думаць, што было б, калі б... І больш не спрабую рассмяшыць Бога. Ёсць так, як ёсць — і з гэтым трэба жыць, успрымаць як дадзенасць. І не зазіраю наперад. Жыву сённяшнім днём. Не ў тым сэнсе, што пражыў дзень, як пражыў — і добра. А ў тым, што вось дзень сёння быў цудоўны: мая сям'я, мае родныя людзі — са мной. Ніхто не захварэў, не здарылася ніякага няшчасця — дзякуй Богу за гэты дзень. І дай Бог, каб наступны быў не горшы.

Ніна РЫБІК.

Гродзенская вобласць.

* *— Усе падзеі і героі сапраўдныя, імёны — таксама, не названыя толькі прозвішчы сям'і і дзяцей па зразумелай прычыне.*

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на III квартал або 2-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 ліпеня** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, тэлевізары «Віцязь» і халадзільн